УДК.373.2

# НАРОДНЫЯ СВЯТЫ ЯК КОМПЛЕКСНАЯ ФОРМА АРГАНІЗАЦЫІ ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

# FOLK HOLIDAYS AS A MEANS OF A COMPREHENSIVE FORM OF ORGANIZATION OF PRESCHOOL CHILDREN'S EDUCATION

***Д. М. Дубініна / D. Dubinina,***
***Д. У. Дубінін / D. Dubinin***
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск, Рэспубліка Беларусь*

У артыкуле размова вядзецца пра народныя святы беларусаў, іх функцыі і комплекснае ўздзеянне на выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту на аснове каштоўнасцей традыйнай культуры беларусаў.

The article deals with the national holidays of Belarusians, their functions and complex impact on the upbringing of preschool children based on the values of the traditional culture of Belarusians.

***Ключавыя словы:*** народныя святы; дзеці дашкольнага ўзросту; духоўна-маральныя каштоўнасці, беларусы.

***Keywords:*** national holidays; preschool children; spiritual and moral values, Belarusians.

Родная культура, па вызначэнні С. Я. Маршака, з'яўляецца неад'емнай часткай душы дзіцяці, той крыніцай, якая напаўняе яго асобу. Асаблівую ролю ў далучэнні выхаванцаў да роднай культуры выконваюць народныя святы, якія з'яўляюцца правадніком культуры, так як наўпрост звязаны з праблемай фарміравання асобы дзіцяці.

Адзначым, што на сённяшні дзень адсутнасць сістэматычнага вывучэння традыцый народнага свята і наладжвання штодзённага жыцця дзяцей па народным календары з'яўляецца прычынай таго, што выхаванцы пачынаюць успрымаць фальклорныя святы як сродак забавы, хоць іх значэнне з'яўляецца больш глыбокім. Менавіта

народныя святы, якія на самой справе павінны выступаць як вынік пражыцця пэўнага этапа народнага календара, адкрываюць магчымасці для ўключэння дзяцей і дарослых у актыўную разумовую дзейнасць, дапамагаюць у выхаванні ўсебакова развітай асобы, садзейнічаюць развіццю ўзаемаадносін у калектыве і фарміруюць пазітыўнае стаўленне да жыцця. Праз народныя святы ў дзяцей развіваецца разуменне культурнай спадчыны; патрэба далучэння да традыцый і звычаяў свайго народа; цікавасць да гульнявой, танцавальнай, песеннай, вусна-паэтычнай творчасці продкаў.

Мэтазгоднасць увядзення народных свят у адукацыйна-выхаваўчы працэс установы дашкольнай адукацыі непасрэдна звязана з разнастайнасцю іх функцый, да якіх мы ў першую чаргу аднясем інфармацыйна-асветніцкую (свята дае звесткі пра народныя абрады і звычаі беларусаў), камунікатыўна-рэгулятыўную (свята сацыялізуе, дапамагае ў працэсе камунікацыі), эмацыйную (свята зараджае станоўчымі эмоцыямі, прыносіць яркія ўражанні, дастаўляе задавальненне), маральна-арыентаваную (свята фарміруе духоўныя каштоўнасці і маральныя нормы паводзін, выхоўвае дзяцей); культурна-творчую (свята развівае творчыя здольнасці дзіцяці, яго канструктыўныя мастацкія ўменні) [1].

Наяўнасць у народным святе базавых складнікаў этнічнай культуры (песня, танец, гульня, казка, загадка, прыказка і прымаўка, мастацкая прадуктыўная дзейнасць, праз якую выхаванцы далучаюцца да культуратворчасці) вызначае яго комплексны характар.

Т. В. Антонава, М. Б. Зацэпіна адзначаюць, што пры дачыненні дзяцей да ўдзелу ў народным святе неабходна памятаць, што старое і новае знаходзяцца ва ўзаемасувязі і, што самае галоўнае, ва ўзаемаразуменні культурнай народнай традыцыі [2].

Удзел ў народным святе дае магчымасць праз розныя віды дзейнасці развіваць у выхаванцаў не толькі мастацкія здольнасці (музычны і паэтычны слых, памяць, вакальныя дадзеныя, пачуццё рытму), але і фарміраваць іх асноўныя духоўна-маральныя каштоўнасці – любоў да Радзімы, сям’і, павага і шанаванне традыцый і звычаяў беларусаў.

Народныя святы спрыяюць падтрыманню спрыяльнага псіхалагічнага клімату ў дзіцячым калектыве, з’яўляюцца своеасаблівай

формай духоўнага самавыяўлення і ўзбагачэння асобы, выхавання маральных паводзін, патрыятычных пачуццяў выхаванцаў.

Комплекснае злучэнне ў народным свяце вусна-паэтычнага слова, спеваў, музыкі і рухаў (гульні, танцы), іх гарманічны сінтэз дазваляе дасягнуць моцнага эмацыйнага ўздзеяння на асобу дзіцяці.

Сярод найбольш часта арганізуемых у дзіцячым садзе народных святаў вызначым такія, як: *«Гуканне вясны», «Саракі», «Купалле», «Дажынкі», «Каляды», «Масленіца»* і інш.

Падрыхтоўка да народнага свята абумоўлена абрадавымі падзеямі народнага календара, які пабудаваны па гадавым цыкле жыцця беларускага народа, а правядзенне народнага свята адаптавана пад умовы дзіцячага сада і сучасныя сацыякультурныя каштоўнасці.

Варта адзначыць, што правільна арганізаваная падрыхтоўка народных святаў – адна з умоў паспяховага іх правядзення. Яна павінна адбывацца паступова, на працягу года, з улікам узроставых асаблівасцей і ўзроўнем падрыхтаванасці выхаванцаў. Падрыхтоўка да свята патрабуе пашырэння кола зносін паміж яго суб'ектамі (дзецьмі, выхавальнікамі, бацькамі), устанаўлення сувязі святкавання з сезоннымі зменамі ў прыродзе, з працай дарослых.

Народныя святы ў сучасным дзіцячым садзе могуць мець форму фальклорнага карнавала («Каляды», «Купалле»), вольнага адпачынку і спартыўных спаборніцтваў («Масленіца»), фальклорнага ранішніка («Саракі»), музычна-літаратурнай кампазіцыі («Дажынкі), тэатралізаванага прадстаўлення на пляцоўцы дзіцячага сада («Гуканне вясны»).

Правядзенню народных святаў папярэднічае сумленная праца выхавальнікаў дашкольнай адукацыі, музычных кіраўнікоў, бацькоў. У якасці асноўных спосабаў падрыхтоўкі выступаюць: назіранні за прыроднымі з'явамі, чытанне і расказванне твораў мастацкай літаратуры і фальклору, гутаркі, краязнаўчыя традыцыйныя і віртуальныя экскурсіі, разглядванне прадметаў побыту, падрыхтоўка касцюмаў, народныя рухавыя гульні.

Асноўнымі відамі культуратворчай дзейнасці пры падрыхтоўцы да святкавання становяцца песенная і музыкальна-рытмічная (развучванне песень, карагодаў, гульняў); выяўленчая (выраб атрыбутаў, неабходных для свята; аздабленне памяшкання ці пляцоўкі (беларуская хатка, музычная зала, гульнявая пляцоўка і інш.);

выраб паштовак-запрашэнняў, падарункаў-сюрпрызаў родным і сябрам), абрадавых прадметаў (птушкі з саломы, аўтэнтычнага цеста; калядныя зорачкі і інш.), тэатральная дзейнасць (выкананне спецыяльных рытуальных дзеянняў, развучванне інсцэніровак, гульні драматызацыі).

У працэсе падрыхтоўкі да свята з дапамогай вусна-паэтычнай творчасці ўзбагачаецца слоўнік выхаванцаў нацыяльна маркіраванымі адзінкамі мовы, вобразнымі словамі і выразамі, прыказкамі, прымаўкамі, заклічкамі, прыгаворамі.

Пад час свята важна ствараць радасную атмасферу. Дзеці павінны адчуць усенароднасць урачыстасці і сваю прыналежнасць да яе. Гэта павінна быць прыкметна ва ўсім: у прыбранні ўдзельнікаў і залы (пляцоўкі), у адмысловым эмацыйным настроі калектыву, у арганізацыі розных відаў дзіцячай дзейнасці [1].

Заўважым, што эмацыйнасць ўспрымання святочнага матэрыялу дзецьмі ўзмацняецца дзякуючы актыўнаму ўдзелу дарослых – бацькоў і педагагічных работнікаў установы дашкольнай адукацыі. Такое правядзенне свята пакідае глыбокі след у дзіцячай душы і ўмацоўвае ў ёй добрыя пачуцці.

Народнае свята як сінтэз практычна ўсіх відаў мастацтваў: літаратуры і фальклору, музыкі, жывапісу, тэатру – дазваляе не толькі даць дзецям новыя веды, але і арганізаваць непасрэдны іх удзел у выкананні абрадаў, спевах народных песень, карагодах, гульнях, танцах, інсцэніроўках.

Так, на 14 сакавіка або на 7 красавіка ў Беларусі звычайна гукалі вясну. Каб развітацца з зімой і паскорыць надыход вясны, у дзіцячым садзе праводзіцца свята «Гуканне вясны». Месца святкавання выбіраецца на ўзвышшы, прасторнае і светлае, (пляцоўка дзіцячага сада), Усё навокал упрыгожваецца рознакаляровымі стужкамі, папяровымі птушкамі. Самаробных птушачак мацуюць як мага вышэй, каб тыя птушкі, якія паляцелі восенню на поўдзень, хутчэй іх заўважылі. Да галінак дрэў прывязваюць яркія стужкі. Гэта сімвалізуе хуткае цвіценне дрэў і кветак. На пляцоўцы дзіцячага сада дзеці водзяць вясновыя карагоды («А мы проса сеялі» і інш.); гукаюць вясну («Гу-уу – прыходзь вясна хутчэй».); гуляюць у вясновыя гульні («Сонейка», «Грушка» і інш). Самае галоўнае – паказаць вясне, што на зямлі радасна і добра. І гэта

галоўная для яе прычына, каб хутчэй прыйсці. «Гуканне вясны» – яркае і самабытнае народнае свята, якое да нашых дзён захавала сваю натуральнасць і жывасць. Абрадавае дзейства гукання вясны (гу-уу, агу-уу, уу) – з'яўляецца ў гэтым свяце вызначальным.

Народныя святы як сродак комплекснай формы арганізацыі выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту спрыяюць далучэнню дзяцей да культурнай спадчыны продкаў, выхаванню ў іх высокіх пачуццяў – эмацыйных, эстэтычных, інтэлектуальных, маральных [3].

Пры правядзенні святаў неабходна імкнуцца да таго, каб даць выхад дзіцячым памкненням да творчасці, спрыяць задавальненню іх жадання ўдзельнічаць у гульнях, танцах, інсцэніроўках і інш. Гэта спрыяе сацыялізацыі выхаванцаў, фарміруе ў іх актыўную пазіцыю і выклікае імкненне захаваць традыцыі і звычаі беларускага народа.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Горянина, Р. А. Фольклорные праздники как средство приобщения дошкольников к народной культуре / Р. А. Горянина // Теория и практика образования в современном мире : материалы VI Междунар. науч. конф. (г. Санкт-Петербург, декабрь 2014 г.). – СПб. : Заневская площадь, 2014. – С. 99–101.
2. Зацепина, М. Б. Народные праздники в детском саду : методическое пособие для педагогов и музыкальных руководителей : для работы с детьми 5–7 лет / М. Б. Зацепина, Т. В. Антонова. – М. : Мозаика-Синтез, 2008. –148 с.
3. Петров, В. М. Весенние праздники, игры и забавы для детей / В. М. Петров, Г. Н. Гришина, Л. Д. Короткова. – М.: ТЦ «Сфера», 2000. – 144 с.